Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Адна з відных дзеячоў іспанскай комуністычнай партыі, член парламента, Даларэс Ібаруры (Пасіянарыя).

КАСТРЫЧНІК 1936 г. № 19 Выданне ЦК КП(б)Б

МЫ З ВАМІ, СЫНЫ І ДОЧКІ ІСПАНСКАГА НАРОДУ!

У начную змену ў ткачых Краснай Прэсні зарадзілася благародная ідэя дапамогі бясстрашным жанчынам і дзецям далёкай Іспаніі.

— Іспанскія работніцы—нашы родныя сёстры!— гэтыя словы, якія ідуць ад усяго сэрца, належаць старой ткачысе Сцепанідзе Васільеўне Капусцінай.—І тут, на Прэсні, у пятым годзе, у снежаньскае паўстанне, царская артылерыя расстрэльвала на барыкадах нашых мужоў, люта біла снарадамі ў нашы дамы... Пашлем-жа, таварышы, прывітанне іспанскім жанчынам, пашлем хоць маленькі падарунак, няхай ведаюць, як любяць іх у Совецкай краіне і жадаюць ад душы ім перамогі!

Па ўсёй краіне прагучэў голас совецкіх ткачых, зваўшых на дапамогу іспанскім дзецям і жанчынам, выклікаючы ўсюды ў гарадах і вёсках нашай вялікай радзімы гарачыя, дзейсныя водгукі.

Выдатную краіну фашысцкія ізуверы хочуць заліць патокамі крыві лепшых сыноў і дочак іспанскага народу. У саборах і на плошчах, на вуліцах і ў дамах фашысцкія бандыты расстрэльваюць бяззбройных людзей, здзекваюцца над старыкамі, жанчынамі і дзяцьмі... Іспанскіх мяцежнікаў шырока падтрымлівае германскі фашызм, не спыняючыся ні перад якімі злачынствамі ў імя сваіх захватніцкіх грабежніцкіх мэт. Працоўныя ўсяго свету не могуць заставацца роўнадушнымі, не могуць маўчаць, калі вырашаецца лёс іспанскага народу, калі штыком, куляй, бомбай і голадам найміты генерала Франко прабуюць задушыць свабодны народ Іспаніі,—яго культуру, яго маладое пакаленне.

Адважныя сыны і дочкі іспанскага народу ў надзвычай цяжкіх умовах адбіваюць націск чорных сіл фашызма, адстойваюць свабодную Іспанію. Тысячы радавых, невядомых гераінь нараджае іспанская рэволюцыя. Яны там, дзе небяспека, яны натхняюць сваіх мужоў, сыноў і братоў на рашучы бой з ворагамі народу.

У муках нараджаецца новы свет Іспаніі. У муках выкоўваюцца сілы рэволюцыі. Дачка іспанскага пролетарыята, выдатная Пасіонарыя ў цяжкія дні барацьбы заклікала народ Іспаніі да штурму капіталізма:

— Наперад, наперад! Народы, якія пакутуюць у страшэнным фашысцкім рабстве, зварачваюць да нас свае погляды, поўныя надзеі. Наш баявы заклік: „Фашызм не пройдзе!“ адкрыў ім вароты аптымізма, таму што яны вераць у нашу антыфашысцкую сілу, таму што яны ведаюць наш рэволюцыйны энтузіязм. Да нас зварачваюцца іх надзеі: яны чакаюць гатовыя кінуцца ў барацьбу. Мы паказалі ім шлях і разам з імі будзем святкаваць таржаство дэмакратычных сіл над цёмнымі сіламі сусветнай рэакцыі.

Там, па той бок Пірынейскіх гор, змагаецца храбры іспанскі народ. Ён зварачае свае погляды ў бок Совецкага Саюза, у нашай барацьбе за соцыялізм працоўныя Іспаніі чэрпаюць сілу, натхненне і энергію. Яны ведаюць, што ўсёй душой мы з імі, што мы не пакінем без дапамогі дзяцей і жанчын мужных байцоў народнага фронта.

У цяжкія і адказныя дні барацьбы, калі змрочныя сілы рэакцыі акружаюць Іспанію, сцякаючую ў крыві, калі бомбы і кулямёты з самалётаў італьянскіх і германскіх фашысцкіх прыяцеляў генерала Франко знішчаюць пасевы сялян, гарады і вёскі, працоўныя СССР шлюць іспанскім жанчынам і дзецям харчовую дапамогу, падтрымліваюць у іх свяшчэнны агонь і веру ў канчатковую перамогу над сіламі контррэволюцыі.

Да берагоў Іспаніі ўжо адплыў першы совецкі параход з харчовай дапамогай ад нашых жанчын дзецям і жанчынам іспанскага народу. Ён павёз масла, цукар, кансервы, кандзіцерскія вырабы. Ён будзе сустрэнут у Іспаніі як сімвал дружбы двух народаў, як палкае прывітанне совецкіх жанчын дзецям і жанчынам Іспаніі, якія змагаюцца за сваю свабоду.

Толькі 12 верасня ткачыхі „Трохгоркі“ звярнуліся з кароткай, хвалюючай адозвай аб дапамозе гераічным іспанскім мацерам і іх галадаючым дзецям. Літаральна ў некалькі дзён гэты рух ахапіў мільёны жанчын нашай краіны, мільёны рабочых і калгаснікаў, мільёны дзяцей і сапраўды стаў усенародным рухам.

На жаночым мітынгу маскоўскай фабрыкі „Ява“ рабочы Салаўёў сказаў:

— Хіба мы, бацькі, не ведаем, як душа баліць за родных дзяцей?

Мы моцна памятаем, як руйнавалі нашу радзіму белагвардзейскія полчышчы ў тады грамадзянскай вайны, як душылі нас голадам інтэрвенты. Мы не дазволім умарыць голадам іспанскіх дзяцей!

Звыш 7 мільёнаў рублёў ужо сабрана ў карысць дзяцей і жанчын рэспубліканскай Іспаніі. Збор сродкаў працягваецца. Справа гонару ўсіх працоўных нашай вялікай радзімы паследваць прыкладу рабочых завода імя Сталіна і завода „Мажэрэз“ імя Л. М. Кагановіча, адлічыўшых у фонд харчовай дапамогі іспанскаму народу адну чвэрць свайго дзённага заработку. У сваёй рэзалюцыі рабочыя завода „Мажэрэз“ пішуць:

„Справа іспанскіх рабочых і сялян ёсць родная справа рабочых і сялян усяго свету. Іх перамога над крывавымі фашысцкімі мяцежнікамі будзе вялікай перамогай дэмакратыі і свабоды над самай чорнай і гнуснай рэакцыяй, над злейшым ворагам усіх працоўных—фашызмам“.

Пролетарыі, інжынеры, тэхнікі і служачыя аўтазавода імя Сталіна лічаць сваім свяшчэнным абавязкам далучыцца да кампаніі дапамогі іспанскаму народу ў яго гераічнай барацьбе за сваю нацыянальную незалежнасць, за сваю перамогу супроць унутраных і знешніх ворагаў.

Гэты свяшчэнны абавязак выканае ўвесь вялікі совецкі народ!

Нацыянальны жаночы камітэт барацьбы супроць вайны і фашызма ў сваім пісьме да жанчын Совецкага Саюза ўсхвалявана дзякуе сваіх совецкіх таварышоў за выдатную дапамогу. Іспанскія жанчыны просяць дапамагчы ім не толькі пасылкай харчоў. Яны адчуваюць патрэбу таксама ў нашых пісьмах, якія падтрымаюць веру і энергію ў змагаючымся іспанскім народзе.

Уся наша краіна—жанчыны, мужчыны, дзеці—аднадушны ў сваім імкненні дапамагчы іспанскім дзецям і жанчынам, якіх фашысцкія гады асуджаюць на голад, чыё жыллё яны руйнуюць. У гэтым выдатным парыве сказваюцца гераічныя традыцыі совецкага народу, у жылах якога цячэ гарачая кроў інтэрнацыянальнай пролетарскай салідарнасці.

Працоўныя нашай краіны—мужчыны і жанчыны—працягваюць руку дапамогі іспанскім жанчынам і дзецям і зварачваюцца да іх з палкім заклікам:

— Мужайцеся, дарагія таварышы, браты па класу! Памятайце—вы не адзінокі. Усім сэрцам, усёй душою мы з вамі, храбрыя сыны і дочкі вялікага іспанскага народу!..

Мы падзяляем вашу нянавісць да ворагаў народу, мы радуемся кожнай вашай перамозе над зграяй ашалеўшых фашысцкіх псоў.

(Перадавы артыкул „Правды").

МАІМ АДВАЖНЫМ СЁСТРАМ

Над абшарам скрываўленых долаў і рэк,
Над магіламі паўшых герояў,—
У высокі свой рост устае Даларэс,
Чутна слова яе агнявое:
„У суровых баях не схіляць галавы!
Гора катам!
Наперад, атрады!"
Грознай песняй гучыць гэты кліч баявы
Ад астурскіх вышынь
да Грэнады.
За дачкою сваёй
светлавокай,
бы дзень,
І гарачай, і строгай, бы маці,—
Сёння смелы народ безупынна ідзе
Чалавечых правоў дабіваца.
Ён усланы касцьмі, гэты полымны шлях,
Ён слязою гаручай абмыты,
Але гора бацькоў па забітых сынах
Стане ў новых баях
дынамітам!
Бо не мала яшчэ засталося
жывых,
што ўзяліся за верную зброю.
Хай пачуе ўвесь свет:
Голас гневу не сціх,
А ўзнімаецца морскім прыбоем.
Прыдзе, прыдзе той час—залатая пара,
што цяпер нараджаецца з болем,—
Разгарыцца жыцця веснавога зара
Над зямлёю Іспаніі
Вольнай.

Эдзі Агняцвет.

На агульнагарадскім мітынгу ў Менску. (Белсаюзфото).

Пісьмо агульнагарадскога мітынгу працоўных Менска

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Родны наш настаўнік, правадыр і друг!

Мы, працоўныя сталіцы ордэнаноснай БССР — гор. Менска, сабраўшыся на мітынг брацкай салідарнасці з іспанскім народам, які вядзе гераічную барацьбу супроць крывавага фашызма, шлем Вам, таварыш Сталін, свайму мудраму настаўніку і любімаму правадыру працоўных усяго свету, натхніцелю і арганізатару сусветна-гістарычных перамог соцыялізма ў СССР, наша палкае прывітанне.

Пад Вашым геніяльным кіраўніцтвам з кожным днём усё лепш, усё прыгажэй, усё заможней і культурней становіцца жыццё працоўных нашай вялікай радзімы.

Вы, таварыш Сталін, з'яўляецеся тварцом і стваральнікам Беларускай совецкай соцыялістычнай дзяржавы. Дзякуючы Вашым штодзённым любоўным адносінам, клопатам і дапамозе беларускі народ заняў ганаровае месца ў вялікай сям'і народаў СССР. Вы стварылі радаснае шчаслівае жыццё для нас і для нашых дзяцей.

Соцыялізм у СССР перамог беспаваротна і канчаткова таму, што правадыром і настаўнікам вялікага совецкага народа з'яўляецеся Вы, таварыш Сталін, бліжэйшы саратнік і верны прадаўжальнік справы вялікага Леніна, таму што вялікая партыя Леніна—Сталіна кіравала і кіруе нашай барацьбой супроць усіх ворагаў соцыялізма.

Пад Вашым непасрэдным баявым вадзіцельствам мы разгромілі белагвардзейскія полчышчы, разгромілі і выгналі вон з нашай совецкай зямлі германскіх і белапольскіх акупантаў, якія хацелі задушыць совецкую рэспубліку і закабаліць народы нашай краіны.

Пад Вашым кіраўніцтвам мы разбілі і дабіваем подлых трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў—гэтых лютых ворагаў народу, шалёных псоў фашысцкіх ахранак, якія прабавалі зноў надзець на шыю працоўных ярмо капіталістаў і памешчыкаў.

Азвярэлыя фашысцкія ізуверы ў сваёй нянавісці да свабоднага совецкага народу бразгаюць зброяй, ствараючы пагрозу новай крывавай бойні супроць працоўнага чалавецтва і, у першую чаргу, супроць Совецкага Саюза.

Але подлыя падпальшчыкі вайны пры першай спробе парушыць свяшчэнныя граніцы нашай соцыялістычнай радзімы будуць змецены з твару зямлі.

Няхай ведаюць драпежныя ваўкі старога свету і іх найміты, што нікому не ўдасца спыніць пераможнае шэствіе комунізма.

Стальной несакрушальнай сцяной мы ўсе згуртаваны вакол нашай слаўнай большэвіцкай партыі, вакол нашага роднага таварыша Сталіна.

Памятаючы Вашы мудрыя ўказанні, мы тут, на стыку з фашысцкімі дзяржавамі, удзесяцярым сваю рэволюцыйную пільнасць, будзем нястомна мацаваць БССР—баявы фарпост нашага вялікага Совецкага Саюза на заходніх граніцах і па першаму закліку нашай партыі і ўрада, па першаму Вашаму, таварыш Сталін, закліку мы ўсе як адзін гатовы стаць грудзьмі на абарону нашай любімай радзімы і нанесці сакрушальны ўдар па ўсіх, хто пасягне на перамогі Вялікага Кастрычніка, хто папрабуе аднавіць праклятый лад капіталізма.

Мы, шчаслівыя працаўнікі нашай выдатнай соцыялістычнай радзімы, не можам спакойна наглядаць, як фашысцкія каты імкнуцца задушыць свабоду і незалежнасць іспанскага народу.

Прасякнутыя пачуццём брацкай інтэрнацыянальнай салідарнасці, мы лічым сваім свяшчэнным пролетарскім доўгам дапамагчы сваім братам і сёстрам па класу, гераічным сынам і дачкам іспанскага народу, якія вядуць барацьбу супроць крывавых фашыстаў.

Мы арганізавалі шырокі збор сродкаў для пасылкі матэрыяльнай дапамогі сем'ям адважных байцоў іспанскай народнай арміі.

Родны наш таварыш Сталін!

Сёння, у дзень мітынгу салідарнасці з працоўнымі Іспаніі, мы моцна абнімаем Вас, наш правадыр, наш бацька, наш настаўнік і друг, і выказваем Вам яшчэ і яшчэ раз сваю бязмежную любоў, сваю беззаветную адданасць, сваю гатоўнасць да канца змагацца пад Вашым мудрым кіраўніцтвам за вялікую справу Леніна—Сталіна.

Няхай жыве наша слаўная большэвіцкая партыя!

Няхай жыве наш родны таварыш Сталін!

(Прынята на мітынгу працоўных гор. Менска на стадыёне „Дынамо" 29 верасня 1936 года).

На дапамогу жанчынам і дзецям Іспаніі

МЫ З ВАМІ, ГЕРОІ ІСПАНІІ!

Жыццё совецкіх жанчын і дзяцей—шчаслівае і светлае. Мы заваявалі яго ў цяжкай класавай барацьбе супроць ворагаў рэволюцыі. Мы добра памятаем тую дапамогу, якую аказвалі нам пролетарыі іншых краін у цяжкія гады грамадзянскай вайны. Зараз, у момант гераічнай барацьбы іспанскага народа, мы не можам стаяць у баку.

Мы, работніцы шчотачнай фабрыкі імя Крупскай, выражаем свае глыбокія пачуцці салідарнасці і гатовы аказаць брацкую дапамогу гераічным жанчынам Іспаніі. Няхай ведае іспанскі народ, што мы заўсёды з ім.

Пры царызме мы жылі ў жабрацтве і беднасці. Такое-ж жабрацкае жыццё жадаюць навязаць працоўным Іспаніі фашысцкія каты.

Мы гарым нянавісцю і злобай да фашысцкай банды.

Няхай ведае іспанскі народ, што мы заўсёды з ім. Няхай мацнее народны фронт Іспаніі!

Стэрліна, Салавей, Шулькіна

Менск, шчотачная фабрыка імя Крупскай

ВІТАЕМ ІНІЦЫЯТЫВУ „ТРОХГОРКІ“

З вялікім уздымам прайшоў мітынг работніц на фабрыцы імя Кагановіча.

Усе аднадушна падтрымалі прапанову работніц „Трохгоркі“ аб аказанні дапамогі прадуктамі працоўным жанчынам і дзецям Іспаніі. Нашы работніцы выразілі свой пратэст супроць азвярэлых іспанскіх мяцежнікаў і іх натхніцеляў—германскіх і італьянскіх фашыстаў, якія імкнуцца затапіць у крыві гераічны іспанскі народ.

Але гэта ім не ўдасца! Іспанскі народ пераможа,—заявілі ў сваёй рэзалюцыі работніцы.

Работніцы пастанавілі адлічыць палову процанта месячнага заработка ў дапамогу іспанскім сёстрам. Думку ўсіх прысутных выказала работніца Вінікава:

— Мы дапаможам мацерам, дзецям і сіротам іспанскага народа, які вядзе гераічную барацьбу за свае правы і свабоду. Мы не змаглі-б замацаваць нашу рэволюцыю, калі-б нам не дапамаглі рабочыя іншых краін.

Выступіўшая тав. Бараноўская вітала ініцыятыву работніц „Трохгоркі“ і прапанавала адлічыць ад яе заработка адзін процант.

Адразу-ж пасля мітынга быў арганізаван збор сродкаў.

Раманава

Віцебск

СЛОВА САЛІДАРНАСЦІ

Мы, работніцы штамповачнага цэха Менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча, не можам спакойна адносіцца да зверскіх расправ і жудасных здзекаў, якім падпадае гераічны іспанскі народ.

Мы добра памятаем зверствы белапалякаў у нас, на Беларусі, у гады акупацыі. Ведаем, на што здольны шалёныя заклятыя ворагі працоўнага народа.

Мы выказваем сваю салідарнасць і працягваем руку дружбы і дапамогі іспанскай жанчыне ў гераічнай барацьбе супроць фашыстаў.

Сэрцы нашы абліваюцца крывёю, калі мы чытаем аб зверскіх, нечалавечных катаваннях, якім падпадаюць жанчыны, старыкі і дзеці Іспаніі.

Пакуль мы заваявалі наша шчаслівае жыццё, мы таксама не мала перанеслі праследванняў і здзекаў з боку класавых ворагаў.

Зараз мы, жанчыны, жывем у шчаслівай краіне Советаў. І ўсё гэта мы ў цяжкай барацьбе заваявалі самі.

Мы завяраем іспанскіх працоўных жанчын, што мы заўсёды гатовы дапамагаць ім у іх гераічнай барацьбе. Нашы сэрцы, думкі і пачуцці заўсёды з імі.

Няхай верыць гераічны іспанскі народ, што перамога—за ім.

Стаханаўкі Люба Цвік,
Нойма Каган

НА ДАПАМОГУ ІСПАНСКІМ РАБОТНІЦАМ

Цыля Сперанская не ведала жахаў інтэрвенцыі і голада. Яна не цярпела ўціску і гвалту эксплаататараў. Яна яшчэ вельмі маладая, нарадзілася ў 1920 годзе і зараз працуе ўсяго 6 гадзін.

Калі на мітынгу чыталі зварот работніц „Трохгоркі“—заўсёды гарэзлівыя, вясёлыя вочы Цылі зацягнуліся туманам. А калі тав. Жмойдзік сказаў, што „фашызм для Іспаніі—гэта мора крыві, гэта голад дзяцей і пакута мацярэй“—яна трымалася-трымалася, а слёзы ўсё-ж паліліся... На мітынгу работніцы заявілі:

— Наша дапамога гераічным дачкам Іспаніі будзе для іх не толькі матэрыяльнай, але і вялікай маральнай падтрымкай!

Пасля сходу арганізавалі збор грошай на карысць іспанскіх жанчын і дзяцей.

Таварыш Абрылоўская ўсхвалявана сказала:

— Трэба матэрыяльна і маральна падтрымаць жанчын, якія вядуць барацьбу з крывавым фашызмам. Яны павінны быць вольныя як і мы! Уношу 10 рублёў і выклікаю ўвесь цэх.

Цэх адгукнуўся на гэты заклік.

Касталеўская

Менск,
фабрыка „Чырвоны тэкстыльшчык“

НАСУСТРАЧ ГІСТАРЫЧНАМУ З'ЕЗДУ

Усе народы Совецкага Саюза дзейна рыхтуюцца да надзвычайнага з'езда Советаў, на якім будзе прынят гістарычны дакумант—Сталінская Канстытуцыя. Дастойна рыхтуюцца сустрэць працоўныя гэты з'езд.

Разгарнула падрыхтоўку да з'езда і фабрыка „Сцяг індустрыялізацыі". Дэпутацкая група членаў совета ўзначаліла гэту падрыхтоўку. Пачалі з дэталёвага вывучэння праекта Канстытуцыі.

Дэпутаты спачатку самі на сваіх занятках добра вывучалі Канстытуцыю. А потым кожны член горсовета быў прымацован да пэўнай групы рабочых. У брыгадах, у часе абедзеных перапынкаў, на кватэрах рабочых, пункт за пунктам вывучалі новую Сталінскую Канстытуцыю, ніводнае слова не засталося незразумелым.

Пытанні, на якія член горсовета не меў магчымасці даць адказ, ён запісваў, высвятляў сам і назаўтра-ж даваў тлумачэнне.

З вялікім інтарэсам і ўвагай абмяркоўвалі рабочыя фабрыкі праект Канстытуцыі. Многа дадаткаў і прапаноў унеслі яны. Інтарэс рабочых не зменшыўся і зараз. Наадварот, ён узрастае.

Займалася дэпутацкая група і другімі пытаннямі.

Горсовет даручыў ёй кантроль над пабудовай сталінскай школы. Штодзённа сачылі члены групы за пабудовай, і ў тэрмін школа была гатова.

— Зараз мы хадайнічаем, каб гэту школу прымацавалі да нашай фабрыкі. Жадаем быць яе шэфамі,—кажа тав. Пятухова, старшыня дэпутацкай групы.

Пры дапамозе стаханаўцаў фабрыкі дэпутацкая група праверыла наказ выбаршчыкаў. І выявілася, што горсовет не выканаў аднаго з пунктаў—пабудову дарогі ад Суражскага тракта да рабочага пасёлку фабрыкі.

Адразу-ж пытанне было пастаўлена на прэзідыуме горсовета. Тут-жа было даручана дэпутацкай групе фабрыкі склясці каштарыс. З планавіком фабрыкі каштарыс складзен на 42.000 рублёў.

— Фінансавая секцыя горсовета абяцала даць 25.000, штонебудзь дасць і дырэкцыя фабрыкі, а для рабочых дарога будзе,—дзелавіта заяўляе тав. Пятухова.

.Кожны дэпутат зрабіў справаздачу перад сваімі выбаршчыкамі. Тых, хто не здолеў апраўдаць давер'е выбаршчыкаў,—адклікалі. Рабочыя зараз добра разумеюць, што яны абіраюць у Советы сваіх прадстаўнікоў для сур'ёзнай работы на карысць рабочаму класу.

Зараз дэпутацкая група занята праверкай рамонта рабочых кватэр і падрыхтоўкі фабрыкі да зімы.

Фабком заключыў дагавары з розныі жактамі. 100 рабочых кватэр павінна быць адрамантавана да першага кастрычніка. 7.000 рублёў фабком адпусціў на гэту справу. Грошы павінны быць правільна скарыстаны.

Да жактаў старшыня дэпутацкай групы прымацавала членаў совета, якія правяраюць правільнасць заключаных дагавораў, сочаць за хуткасцю рамонта. І гэта дае добрыя вынікі: хутка кватэры будуць адрамантаваны.

Шмат чаго зрабіла дэпутацкая група, працуючы планава і сістэматычна.

— Я ўсвядоміла, што да нас, выбраных у Советы, прад'яўляюцца вялікія запатрабаванні. Мы-ж абраны ў органы ўлады. Нам рабочыя аказалі вялікае давер'е. Таму я ўвесь свой вольны час аддаю рабоце дэпутацкай групы, дабіваюся, каб яна на фабрыцы працавала добра. Мы спаборнічаем з дэпутацкай групай Менскага горсовета і пакуль што не здаем,—горда дадае тав. Пятухова.

Старшыня дэпутацкай групы Маня Пятухова—не толькі лепшая актывістка, яна і на вытворчасці адна з лепшых. Яна стаханаўка, брыгадзір стаханаўскай брыгады касцюмнага цэха. У яе брыгадзе 40 чалавек.

У мінулым годзе гэта брыгада лічылася апошняй. А зараз гэтыя людзі добра працуюць, яны служаць для другіх брыгад прыкладам у перавыкананні плана.

— Ночы не сплю, усё мяркую, як лепш паставіць работу ў брыгадзе. Пакуль што ацэнка нашай работы добрая, але да з'езда Советаў хачу даць яшчэ лепшыя паказальнікі,—задумліва кажа брыгадзір.

У часе падрыхтоўкі да з'езда Советаў дэпутацкая група разам з усім калектывам фабрыкі працуе над тым, каб канчаткова знішчыць брак.

Вялікая работа разгарнулася зараз на фабрыцы. Праведзены канферэнцыі стаханаўцаў, начальнікаў цэхаў, брыгадзіраў, майстроў, агульна-вытворчыя канферэнцыі ўсіх рабочых. Многа каштоўных прапаноў сабрана за гэты час.

Падрыхтоўка да з'ездаў Советаў выклікала новую хвалю творчай актыўнасці рабочых фабрыкі.

Стасіна

Віцебск

Стаханавец-фуркіст шклозавода імя Сталіна т. Махненка пасля работы гуляе з сваёй дачкой Волечкай у заводскім парку.
(Белсаюзфото).

Зноў вясёла загудуць шпулькі

На яе энергічным твары заўсёды ўсмешка. Рухлівая постаць, імклівая хада і прыемны голас вельмі ўдала дапаўняюць бадзёры выгляд Еўдакіі Васільеўны Раманавай.

Яна не адчувае свае 57 год. Бадзёрай, жыццёрадаснай, заўсёды ўважлівай да другіх—такой ведаюць яе ўсе работніцы ільнопрадзільнай фабрыкі імя Кагановіча.

Гэта хударлявая жанчына камуністка—вылучаецца вялікай скромнасцю, уласцівай большэвікам. Яна не любіць многа гаварыць—гэта чалавек справы. Дзіву даешся, калі яна толькі адпачывае? Раніцой, позна ўначы можна яе ўбачыць на розных пасяджэннях на фабрыцы, у цэху, у брыгадзе, на кватэры работніц. Чырвоная хустачка намесніка старшыні фабкома заўсёды мільгаціць у гушчы работніц. Дзе-б не была Раманава—заўсёды навокал яе некалькі дзесяткаў работніц.

Бо гэта-ж—свой, блізкі чалавек. Тав. Раманава—старая работніца фабрыкі. Сваё жыццё яна моцна звязала з гэтай фабрыкай. На фабрыцы прайшло яе горкае дзяцінства, яе маладосць, на фабрыцы-ж яна зараз пазнала шчаслівае жыццё.

Рэдка смяялася ў сваёй маладосці Раманава. Не да смеху было ёй. Ёй трэба было шмат працаваць: на яе ўтрыманні пасля смерці бацькі засталася цэлая сям'я.

Шмат працавала Дуня, кладучы сваё сілы і здароўе на эксплаататара-бельгійца. Здавалася ёй, моцна закаваны ланцугі і ніколі іх не разбіць. Але рэволюцыя разбіла ланцугі! Вызваліла яна працоўных ад прыгнёту і эксплаатацыі, вызваліла і тав. Раманаву.

Радасна ўздыхнулі работніцы, калі не стала эксплаататараў на фабрыцы. Гаспадарамі пачалі адчуваць сябе. Але ў цяжкія гады грамадзянскай вайны разруха дала сябе адчуць. Не хапала паліва, сыравіны. Корпус за корпусам спынялі сваё жыццё.

Маладыя рабочыя, якія нядаўна прыйшлі з вёскі, пакінулі фабрыку і вярнуліся на сельскую гаспадарку. На фабрыцы засталіся толькі карэнныя рабочыя.

— Наша фабрыка! Нікуды не пойдзем,—заявілі работніцы.

І не пайшлі. Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі пачалі аднаўляць фабрыку. Арганізоўвалі суботнікі, пад музыку аркестра грузілі дровы на паліва для фабрыкі. На суботнікі ішлі паўгалодныя, поўапранутыя, але поўныя свядомасці: аднаўлялі фабрыку для сябе. З вялікімі цяжкасцямі даставалі сыравіну, без зарплаты працавалі. Але перамаглі.

Крок за крокам аднаўлялася фабрыка. Паступова ўсе карпусы пачалі працаваць. Першымі ўдарніцамі сталі старыя работніцы: Раманава, Мяккая, Марчанка, Максімава, Сава.

Сталі зварачвацца з вёскі рабочыя. І фабрыка зажыла поўнакроўным жыццём.

Не маглі нарадвацца старыя работніцы, гледзячы на сваё дзецішча—фабрыку. Новыя карпусы выраслі на месцы старых. Новыя дамы для рабочых, новыя скверы ператварылі Маркаўшчыну ў прыгожы, непазнавальны гарадок.

Да 1935 года ільнопрадзільная фабрыка імя Кагановіча была адным з першых прадпрыемстваў горада Віцебска, як па выкананню плана, так і па пастаноўцы работы.

Але цяпер фабрыка ў цяжкім становішчы. Паўтары гады ўжо фабрыка ў прарыве. План не выконваецца (у 1935 годзе—98 проц., за першае паўгоддзе 1936 года—87 проц.).

Цяжка перажываюць гэта старыя работніцы фабрыкі:

— Становішчам фабрыкі некалькі разоў займаліся нашы партыйныя і совецкія арганізацыі. Яны дапамагалі нам, але зруху пакуль што няма. Балюча ад гэтага, вельмі балюча,—кажа работніца тав. Верхалазава.

— Здаецца, перавярнула-б усё, каб толькі не было гэтай ганьбы за намі,—дадае тав. Вараб'ёва.

Дырэкцыя спасылаецца на аб'ектыўныя прычыны: сыр'ё дрэннае, цякучасць рабочай сілы і т. д. Але няма аб'ектыўных прычын, няма такіх цяжкасцей, якіх-бы нельга было перамагчы.

У прарыве вінаваты толькі кіраўнікі фабрыкі. Дрэнна кіравалі яны соцыялістычным прадпрыемствам, якое ім даручыла партыя. Самазаспакоіліся на дасягнутых поспехах мінулых гадоў. Не прыслухоўваліся да прапаноў старэйшых работніц. Дрэнна ўзначалілі стаханаўскі рух, не склалі ўмоў для работы стаханаўцаў.

Чаго варты, напрыклад, такія справы, як недахоп шпулек? А з-за гэтых „дробязей" лепшыя стаханаўкі не выконваюць нормы, прастойваюць цэлыя брыгады і машыны.

Работніцы заяўляюць, што крытыка і самакрытыка на фабрыцы ў загоне.

Сёння ўжо ўсім ясна, што работнік, які не любіць крытыкі і самакрытыкі, няўхільна губляе большэвіцкую пільнасць, неабходную якасць кожнага большэвіка—партыйнага і не партыйнага.

Толькі гэтым і тлумачыцца, што на фабрыцы доўгі час мог арудваць заядлы вораг партыі і народа трацкіст Рохкінд. Доўгі час шкодзіў ён, будучы ў кіраўніцтве фабрыкі. Зараз ён выкрыт.

За дрэнную работу дырэктар Марушкін аслабанён ад работы, кіраваць фабрыкай прызначан новы дырэктар.

— Фабрыка імя Кагановіча зноў стане ў рады перадавікоў,—упэўнена заяўляе Еўдакія Васільеўна член пленума Саюза тэкстыльшчыкаў і член прэзідыума горсовета.

— Прыкладзем усе сілы, каб зняць ганьбу з нашай фабрыкі—у адзін голас заяўляюць работніцы.

Віцебск **Пятроўская**

Пляма будзе змыта

Рытмічнае цоканне флангавых трыкатажных машын не перашкаджала Ані Квяткоўскай абдумваць складанае пытанне.

Днямі яна прачытала ў „Правде“ рад артыкулаў, выкрываючых бракаробства на трыкатажных фабрыках. Гэтыя артыкулы ўсхвалявалі дзяўчыну.

Сем год працуе яна на вытворчасці, паступіла туды яшчэ вучаніцай. Развівалася і расла на вытворчасці, зраднілася з ёю. Цяпер яна ўжо кандыдат партыі і сакратар комсамольскай арганізацыі. Яна вучыцца ў вячэрнім Комвузе. І жыццё ў яе поўнае да краёў. А наперадзе—шырокі, ясны шлях.

Але зараз Квяткоўская заклапочана. Пытанне пра непаладкі на вытворчасці мучае яе, а непаладкаў шмат на фабрыцы „Чырвоны тэкстыльшчык“.

— Ведаеш, Аня, глядзець не хочацца на нашы пальчаткі. Пачынаючы з цвікеля і канчаючы ўцюжкай—усё брак і брак. Не так трэба было-б працаваць,—скардзілася нядаўна Ані Надзя Макарэвіч, а Ольга Кірыльчук дадала:

— Нашы бракоўшчыкі не бачаць ні крывога цвікіля, ні пропускоў машыны... Ды і на базе прымаюць халатна...

Было аб чым задумацца Ані.

Рэзка прагучэў званок, абвяшчаючы перапынак, і ў дзвярах цэха з'явілася маладая, з прыгожым размахам чорных броваў Кастальская—старшыня фабкома.

— Таварышы. Пасля сканчэння работы ўсе на сход.. Абавязкова!

— Лена, а па якому пытанню?—запыталася адна з работніц.

— Даклад дырэктара аб якасці прадукцыі і аб браку,—адказала Кастальская.

Яе мігам абкружылі работніцы і закідалі пытаннямі.

Сход працякаў бурна. Работніцы актыўна выяўлялі слабыя бакі сваёй вытворчасці і ўносілі разумныя прапановы. Аня Квяткоўская разгарэлася: белы берэт адцяняў яе разрумянены, поўны твар. Шэрыя вочы блішчэлі, а кучаравыя светлыя валасы распушыліся, як залатое воблака.

— Нашы бракоўшчыкі прапускаюць брак другім гатункам. На іх ціснуць майстры, а база не правярае... Майстар павінен бесперапынна наглядаць за працэсам работы... Недахопы выпраўляць тут-жа на-хаду... казала яна ўсхвалявана.

Работніцы дружна падтрымалі выступленне сваёй любіміцы.

Неяк вярнуўшыся дамоў з Комвуза, Аня ўзялася гатаваць вячэру.

У пакоі было ціха і светла. Белыя фіранкі і кветкі на вокнах, чыста засланыя ложкі і абрус на стале рабілі пакой утульным і прыемным.

Аня жыве з маткаю і двума сёстрамі. Старэйшая Нэллі працуе на заводзе „Большэвік“, малодшая Ванда—піонерка, вучаніца на той-жа фабрыцы, дзе працуе Аня.

Маці ганарыцца сваімі дачкамі.

— Слаўныя ў мяне дзяўчаты... Сур'ёзныя і працавітыя. І сыны не дрэнныя, абодвы ў Чырвонай арміі. А вось дочкі са мною, у сваім гняздзе...

Маці—служачая таго-ж Комвуза, дзе вучыцца дачка.

Пакуль Аня завіхалася з вячэраю, уляцела жвавая, як птушка, Ванда.



Майстар пальчатачнага цэха т. Квяткоўская за работай.

— Што спазнілася?—сустрэла яе сястра, глянуўшы на гадзіннік.

— Затрымалася з Олей. Яна казала, што цябе вылучылі майстрам пальчатачнага цэха.

— Мяне?

— Ну, так!.. Цяпер ты будзеш начальства! Хіба дрэнна?..

Доўга ў гэту ноч не спала Аня. Майстар, а ці справіцца яна? Прыдзецца перайсці на другую вячэрнюю змену. Як-жа быць з вучэннем? А комсамольская арганізацыя?!.

„Не, адмоўлюся! Нельга паспець усюды. А кінуць Комвуз не хочу, ды і права не маю",— цвёрда рашыла Аня.

„А ці маеш ты права адмаўляцца, тады, калі партыя патрабуе перабудаваць работу на вытворчасці, каб даваць працоўным прадукцыю высокай якасці?— шапнула Аніна сэрца.

Яна ўскочыла. Павярнула выключацель. Электрычнасць гарэла яскрава. Схапіўшы газету, Аня зноў уважліва прачытала ўсе артыкулы пра барацьбу з бракам. І стала ясна—яна не адмовіцца!

* * *

Прайшло каля двух тыдняў. Майстар пальчатачнага цэха Анна Іванаўна Квяткоўская абыходзіла сваю істужку. У гэтай істужцы было 60 чалавек.

Пільныя вочы заўважалі ўсе памылкі, чулае вуха лавіла неправільны стук машын. Тады яна спяшалася да работніцы.

— Выключай! Машына петліць...

Машыну тут-жа спраўлялі, і зноў стракатала іголка, робячы роўную строчку на пальчатцы.

Бракоўшчыкі пачалі правяраць стражэй. Некаторыя работніцы скардзіліся на іх майстру:

— За кожную дробязь пішуць брак. Як тут стаханаўцам стаць?

— Ды Стаханаў-жа браку не робіць! І вы старайцеся працаваць таксама без браку,—адказвала Квяткоўская.

Зашавялілася і база Белкаапсаюза. Сталі адтуль паступаць назад пачкі бракаваных пальчатак.

Гэта было непрыемна ўсёй істужцы. Работніцы зразумелі, што не прыдзірчывасць бракаведаў з'яўляецца прычынай браку, а ўласная неахайнасць. Яны цвёрда рашылі падняць якасць прадукцыі сваёй фабрыкі.

— Мы заўсёды павінны памятаць, што яшчэ на XVI парт-з'ездзе таварыш Сталін назваў дрэнную якасць прадукцыі „ганебнай плямай". Мы даб'емся таго, каб гэта пляма з нашай фабрыкі была змыта начыста!

Так гаворыць майстар Квяткоўская сваім сяброўкам.

Владзімірава.

Менск

Адмаўляюцца ад ільгот

На прызыўным пункце Лёзненскага раёна адчувалася радасць і шчасце прызываемых. Музыка, спевы, размовы аб будучым, аб манеўрах Беларускай ваеннай акругі можна было пачуць у кожным кутку.

Пачалася работа прызыўнай камісіі. Адзін за адным выходзілі маладыя прызыўнікі. Іх радасці не было канца, кожны ажыўлена паведамляў таварышам, што прынят у рады Чырвонай арміі, што ён—будучы баец.

У прызыўную камісію з'явіўся Васіль Прароўскі. Ён фізічна моцны, добрапісьменны. Урачы зрабілі ў яго картцы адзнаку „здароў". Але прызыўная камісія, як ільготніку, адмовіла яму ў прыёме ў рады РСЧА.

Назаўтра Васіль зноў з'явіўся ў прызыўную камісію. Разам з ім прышла і яго жонка Софья. Яна падала заяву з просьбай прыняць яе мужа ў Чырвоную армію.

— Мой муж Васіль хоча пайсці ў рады Чырвонай арміі,— пісала яна.—Прашу яго просьбу задаволіць. Мы з сынам матэрыяльна забяспечаны і адмаўляемся ад ільгот.

Камісія задаволіла просьбу Прароўскага і яго жонкі, і яны шчаслівыя пакінулі прызыўны пункт.

Сярод жыццярадасных, фізічна моцных, вясёлых юнакоў—будучых байцоў Чырвонай арміі, сядзела старая маці прызыўніка Паканава. Яе зморшчаны твар і сівыя валасы гаварылі аб тым, што за свой век яна перажыла многа пакутных дзён.

Аніcся Паканава прышла прасіць прызыўную камісію, каб яе сына Міхея прынялі ў рады Чырвонай арміі, бо яна адмаўляецца ад прадастаўленай ільготы.

Аніcся прасіла:

— „Я жадаю, каб Міхей пайшоў у нашу любімую Чырвоную армію. Служба ў Чырвонай арміі— гэта гонар".

Просьбу Паканавай задаволілі. Міхея залічылі ў артылерыю. Аніcся з радасцю разам з сынам пайшла дадому.

Такіх як Прароўскія, Паканавы ў нас тысячы. Маладыя патрыёты сваёй краіны ахоплены адным жаданнем—разам з усім совецкім народам, са слаўнай Чырвонай арміяй, з першым маршалам Совецкага Саюза тав. Варашылавым, абараняць межы нашай соцыялістычнай бацькаўшчыны, абараняць наша квітнеючае, прыгожае і шчаслівае жыццё. А іх мацеры, жонкі, сёстры сваёй любоўю і адданасцю да нашай, вялікай радзімы натхняюць іх на яшчэ большую пільнасць у ахове шчаслівай працы шчаслівага совецкага народу.

Міхась Шуранкоў

Комсамолка т. Горфінкель стаханаўка чырвонасцяжнай швейнай фабрыкі „Кастрычнік", выконвае план на 180 проц. (Менск).

(Белсаюзфото)

Жыццё заквітнела

Малацьба ў калгасе імя БВА Любаньскага раёна.
(Белсаюзфото)

З даўніх часоў на павароце Дняпра стаяла вёска Шыхава. Каля двухсот сялянскіх двароў, адрэзаных ад раённага цэнтра трыццацю кілометрамі, жылі амаль па старынцы.

Уціск багацеяў прымусіў беднату выселіцца з Шыхава. Пайшло каля ста двароў. Частка пабудавалася за рвом і пасёлак пачаў называцца „Зароўскім“. Другая частка пацягнулася ўгару, па лугавым беразе Дняпра, і назвала свой пасёлак „Дружны“.

Прышоў 1929 год і навасёлы з'ядналіся ў калгас, каб назаўсёды пакончыць з жабрацкім жыццём. А старая, заможная Шыхаўка кпіла:

— Таксама калгаснікі, мякіну жваць будзеце!..

Але прайшло сем год і ўся Шыхаўка стала калгаснай. Кулакоў выселілі, каб не перашкаджалі будаваць заможнае жыццё. Калгаснікі моцна ўзяліся за справу. І заквітнела калгаснае жыццё на славу!

З кожным годам калгас робіцца мацней і заможней. Добра пастаўлена жывёлагадоўчая ферма. У ёй з маладняком 370 галоў рагатай жывёлы і 280 коней. Ёсць авечкі, свінні. Разбілі пладовы сад на дзесяці гектарах. Ёсць у ім і грады клубнікі.

Шмат клопатаў, шмат і справы у старшыні—Праскоўі Трафімаўны Ганджуравай, але гэта яе не пужае.

Тры гады працавала Ганджурава брыгадзірам.

Гарачая ў рабоце, яна імкнулася кожную справу зрабіць як мага лепей. Такіх-жа адносін да работы яна патрабавала ад усёй брыгады. Гультаям паблажкі не давала, а распараджацца ўмела без крыку і цвёрда.

Ганджураву сталі паважаць і слухацца. Затое дома муж буяніў:

— Чаму ў хаце не сядзіш? Дзеці цябе не бачаць, гаспадарка без нагляду.

У першы-ж год работы брыгадзірам арганізавала яна ў калгасе лікбез і ў ім сярод шасцідзесяці чалавек ліквідавала сваю непісьменнасць.

Хатняй рабоце прысвячала ўвесь выходны дзень. Пякла, мыла, абшывала дзяцей... Усё гэта рабіла з ліхаманкавай спешкаю, каб заўтра зноў быць у брыгадзе і каб усе пяцёра дзяцей былі ў парадку. Але мужу гэта не падабалася і пайшоў ён з дому. А Праскоўя Трафімаўна працягвала працаваць так-жа аддана.

Работу жанчыны—брыгадзіра ацаніла совецкая ўлада.

З радасцю паказвае Праскоўя Трафімаўна ганаровую грамату, атрыманую ў Менску. Яна ніколі не забудзе гэты дзень, калі ўсе святкавалі 15 гадавіну вызвалення Беларусі ад белапалякаў і ўручэнне рэспубліцы высокай узнагароды—ордэна Леніна. Праскоўю Трафімаўну прэміравалі пуцёўкай на курорт і дапамаглі грашыма. Узрадвалі яе чулыя адносіны, але больш за ўсё радуюць Ганджураву палымнеючыя словы граматы: „За актыўны ўдзел у барацьбе за паспяховае выкананне задач соцыялістычнага будаўніцтва БССР“...

У гэтым годзе лепшага брыгадзіра калгаса імя Косарэва, Праскоўю Трафімаўну Ганджураву, выбралі старшынёю калгаса. Работа цалкам захапіла яе. Усе думкі, усе пачуцці, усе сілы аддае яна рабоце.

Прайшло ўсяго два месяцы са дня перавыбараў і калгас ужо атрымаў пераходны сцяг за здачу ільновалакна.

Не лёгка даўся гэты сцяг! Не гледзячы на засушлівае лета, лён вырасцілі на славу. Густы, у метр дзесяць сантыметраў вышынёю.

Было так. Ціхая і ветлівая Фядора Дзегцярова на калгасным сходзе ўзяла абавязацельства даць замест звычайных трох цэнтнераў ільновалакна з гектара—пяць. Сумняваліся старыя калгаснікі, здавалася ім—не справіцца худзенькая Фядора з узятым абавязацельствам. Звяно імя Марыі Дземчанка—Фядора, Глушанкова і Софья Прылепа,—узялося за справу па-стаханаўску. Вырасцілі лён на заглядзенне. Не перашкодзіла і засуха, сабралі каля 7 цэнтнераў з гектара. Прыходзілі старыкі і старухі любавацца. Расцвіталі ўсмешкамі, качалі галовамі:

— Ай ды лён! Добры!.. І не прыгадаеш, калі ў нас быў такі. Гэта—так, гэта—ураджай!

Убралі лён, замачылі, высушылі, А як стала Фядора трапаць лён, па-стаханаўску даючы па 43 кілограма ў дзень, любаваліся калгаснікі шаўкавістым валакном.

Любяць, моцна любяць калгасніцы-ільнаводкі сваю справу і спраўляюцца з ёю на „выдатна“.

Піонеры соўгаса імя 10-годдзя БССР Брагінскі раён

Фото Фрыда.

Стаханаўскае ільнаводчае звяно, калгас „Іскра“ Дубровенскага раёна. Злева направа: звеннявая Аксінья Карніцкая, Ліза Полавачова і Ольга Сашанава.
(Белсаюзфото)

* * *

Неба па асенняму шэрае, воблачнае. На закаце расквітнела пунсовымі праменнямі схаваная за краявідам сонца. Задумлівая бяроза ўпляла жоўтыя янтары ў свае даўгія зялёныя косы. Наўкол шчаціліся зжатыя палі, сярод якіх шэрымі палотнамі ляжала ўзнятая зяб. Толькі густая батва бульбы раскінулася зялёным дыванам.

„Трэба ўзмацніць копку бульбы. 130 гектараў не так проста ўбраць“, — падумала Ганджурава, углядаючыся ў загусцеўшыя змрокі.

У засвяжэўшым паветры зазвінела меладычная песня. Гэта калгасніцы вярталіся з уборкі бульбы.

Дома дзеці чакалі Ганджураву, а яна стаяла зачараваная песняй і вячэрнімі шолахамі. А праз мінуту, страсануўшы галавою, рашучым крокам збочыла са сваёй дарогі і пайшла на новую ферму. Трэба было паглядзець, як там. На гэту ферму вылучан маладняк—коні і каровы. Старшыня кожны вечар, вяртаючыся дамоў, робіць вялікі канец у бок, каб праверыць, ці ўсе хлявы і канюшні ў парадку.

Агледзіўшы ферму і пагутарыўшы з дзяжурнымі вартаўнікамі, заспакоеная рушылася яна дамоў.

У акне слаба мільгацеў агеньчык. Насустрач гаспадыні зазвінеў ланцугом стары Лыска. За сталом, пры святле лямпы, Алёша і Соня рыхтавалі ўрокі.

Прылашчыўшы дзяцей, Праскоўя Трафімаўна хутка пераапранулася. Ёй трэба паспець у клуб, дзе сабраліся пасля працоўнага дня калгасніцы, каб правесці збор грошай на пакупку прадуктаў для іспанскіх жанчын і дзяцей.

Два кілометры да клуба. Дарога ідзе міма школы, палямі. Вячэрняй прахладай дыхаў Дняпро. Ветрык разагнаў воблакі, яркімі іскрамі залаціліся зоркі на цёмным небе. На бульбяных палях відаць былі земляныя пірамідкі з пучкамі саломы наверсе. Гэта—капцы. Ганджурава пільна сачыла, каб дзяржава атрымала высокагатунковы прадукт і таму прымушала выкапаную бульбу ссыпаць у капцы, каб яна не падпадала начной вільгаці і замаразкам.

Бульба ў калгасе імя Косарэва ўрадзілася добрай. Будзе добрая і капуста. Не мала над ёю папрацавалі калгаснікі, абіраючы рукамі гусеніцу—шкодніка.

Калгас спяшаецца поўнасцю разлічыцца з дзяржаваю. Працадзень абяцае быць поўнацэнным.

— Да добрага, квітнеючага жыцця вядзе нас таварыш Сталін—і таму працуецца радасна! Паслухайце, як пяе наша моладзь. Весела ім працаваць, ведаюць, што жыццё культурнае і сытае настала,—гаворыць Ганджурава, і яе васільковыя вочы ззяюць.

Ан. Алмацінская

Жлобінскі раён

Фёкла Міхайлаўна доіць сваю рэкардыстку „Вішню".

Ордэнаноска Фёкла Міхайлаўна

„А чым я горш за стаханаўцаў? Няўжо я не змагу так працаваць, як яны?" думала Фёкла Міхайлаўна.

І на першым-жа сходзе, калі ўпершыню абмяркоўвалі стахановскія метады работы, Фёкла Шамко горача выступіла:

— Мы таксама можам працаваць па-стаханаўску. Для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці. Патрэбна толькі жаданне і наша добрасумленная работа.

На дапамогу прышлі дырэктар і палітаддзел соўгаса і работа пайшла па-новаму. Калі што не ладзілася, — Фёкла Міхайлаўна шла ў палітаддзел, у рабачком, да дырэктара — і непаладкі знішчаліся.

Расла колькасць надоенага малака па ўсяму соўгасу. Сярэднягадовы ўдой ад каровы ў соўгасе складаў 3115 літраў, а Фёкла Міхайлаўна ад прымацаваных да яе 15 кароў надаіла па 3200 літраў.

Як лепшую стаханаўку жывёлагадоўлі, паслалі яе ў Маскву на Ўсесаюзную нараду перадавікоў соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

Добрасумленную працу ацанілі па заслугам. Саюзны ўрад узнагародзіў Фёклу Міхайлаўну Шамко ордэнам „Знак почета". Ніколі не думала Фёкла Міхайлаўна, што заслужыць такі гонар. У прысутнасці самога таварыша Сталіна Ўсесаюзны староста Міхаіл Іванавіч Калінін уручыў ёй ордэн. Забілася сэрца ад радасці, затуманіліся вочы слязмі. Але гэта былі слёзы шчасця і гонару. На ўсё жыццё запомніла Фёкла Міхайлаўна гэтыя хвіліны.

А калісьці ведала Фёкла Міхайлаўна іншыя слёзы.

Бацька яе — стары Міхайла — усё сваё жыццё батрачыў у графа Чапскага. Шмат працавалі яны з жонкаю, а ўсё-ж сям'і хлеба не хапала. Дзесяцера дзяцей было ў Міхайлы, дзе-ж іх усіх накарміць!

Рана пайшла працаваць на пана і Фёкла. Не раз паспрабавала бізуноў, не раз пралівала яна горкія слёзы, слёзы адчаю і нянавісці.

А калі прагналі паноў і на абшарах кравапіўцы Чапскага арганізаваўся соўгас, Фёкла першая пайшла туды. Спачатку была на палявых работах, а вось ужо 12 год працуе даяркай.

Моцна палюбіла Фёкла сваю работу. Даглядае кароў, як сваіх родных дзетак. І вывела яна сваіх кароў на першае месца па колькасці і якасці малака.

А як атрымала тав. Шамко высокую ўзнагароду — ордэн, яшчэ лепш пачала яна працаваць, каб выканаць абяцанне, дадзенае любімаму Сталіну — вывесці ў клас рэкардыстак пяць кароў і дабіцца 4.000 літраў малака ад кожнай.

І сваё слова Фёкла Міхайлаўна стрымае. Ужо на 15 верасня яна надаіла ў сярэднім па 2630 літраў малака ад сваіх 15 кароў, а ад рэкардыстак — каля 4.000 літраў.

Да раённай сельска-гаспадарчай выстаўкі соўгас рыхтуе сваіх

112.000 даходу

Першым у Лёзненшчыне выканаў кантрактацыйны дагавор па здачы ільнотрасты калгас „Прагрэс“ Гладанскага сельсавета. На 6 верасня ён здаў на ільнозавод звыш 500 цэнтнераў трасты трэцім нумарам.

Што забяспечыла гэту перамогу? Толькі старанны догляд за ільном. Ільну—вядучай культуры раёна—калгаснікі і калгасніцы надалі выключную ўвагу. Уся іх работа праводзілася пад лозунгам „Лён—крыніца заможнасці“.

З пачатку палявых работ у калгасе арганізавалі 6 ільнаводных звенняў, замацавалі за імі пэўныя ўчасткі ільну.

Сорак пяць гектараў ільну засеялі рана. Глыбока і мякка апрацоўвалі глебу. Сеялі выключна па канюшынішчу і добра ўгноенаму ржанішчу. Акуратна заворвалася насенне.

З часу з'яўлення прыгожых, зялёных усходаў ільняныя пасевы былі пад пільным наглядам усіх калгаснікаў.

У часе росту калгасніцы падкармлівалі, а ў гарачыя дні паліравалі свой лён.

І лён вырас, як гаворыцца, на дзіва. Ільняныя палі акрыліся высокім, суцэльна-ізумрудным дываном. Пры цераблені яго сартавалі па росту, на два-тры гатункі. Пры расціле скарысталі буйныя жнівеньскія росы.

Ніводнага дня, нават ніводнай лішняй гадзіны не пералежваў лён на сцелішчах. За гэтым пільна сачыла намеснік старшыні калгаса па ільну — энергічная, жыццерадасная, 22-х гадовая калгасніца Ганна Бернацкая.

Вось што расказвае Ганна пра сваю работу:

— Абы як рассцілаўшы трасту, высокага нумару атрымаць нельга... Таму перад рассцілам мы сартавалі трасту па даўжыні, таўшчыні і колеру сцяблоў. Сартавалі яе і пры пад'ёме са сцелішчаў. Своечасова была ўзнята ільнотраста. Лепшую адвезлі на ільнозавод, горшую пакінулі для пераапрацоўкі. Але аб якой „горшай“ трасце можа ісці тут гутарка, калі першая партыя валакна здадзена 18—20 нумарамі, а на завод здалі мы трасту 3 нумарам?!

З асаблівым захапленнем дзеліцца Ганна ўражаннямі аб атрыманых за лён прыбытках. Калгас сёлета атрымлівае за лён 112 000 рублёў, замест 10 000 у мінулым годзе. Такім чынам, на адзін калгасны працадзень прыпадае 7 рублёў толькі грашыма, не лічачы збожжа і іншых сельска-гаспадарчых прадуктаў (летась атрымлівалі 77 капеек за дзень).

Вестка аб перамозе калгаса „Прагрэс“ хутка абляцела ўсе калгасы Лёзненскага раёна. Асабліва вясёла выглядалі твары калгаснікаў і калгасніц арцелі „Прагрэс“. Сабраўшыся на калгасны двор, група калгасніц пачала гутарку аб справах, аб надыходзячым вялікім калгасным свяце.

Восьмага верасня калгасны клуб набыў прыгожы выгляд. Усе сцены былі аздоблены зеляніною, прывітальнымі лозунгамі і партрэтамі любімых кіраўнікоў партыі і ўрада.

Да пачатку калгаснага свята моладзь арганізавала танцы. Калі ўжо зусім сцямнела, прыехалі госці і сярод іх ордэнаноска тав. Селязнёва і член ЦВК БССР тав. Кавалёва.

Пасля ўрачыстай часткі старшыні калгаса ўручылі пераходны чырвоны сцяг. У заключэнне свята 25 лепшых стаханаўцаў соцыялістычных палёў былі прэміраваны каштоўнымі падарункамі. У ліку прэміраваных—пераважная большасць калгасніц маладых дзяўчат.

Калгаснае свята скончылася масавымі танцамі і спевамі вясёлых частушак, услаўляючых заможнае, калгаснае жыццё.

* * *

А неўзабаве перамогу калгаса „Прагрэс“ адзначыў у прывітальнай тэлеграме сакратар Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б **Мікалай Фёдаравіч Гікало**.

„ЦК КП(б)Б вітае кіраўніцтва, усіх калгаснікаў і калгасніц калгаса „Прагрэс“, адным з першых у рэспубліцы і першым у Лёзненскім раёне выканаўшага дзяржаўны план, здаўшы 519 цэнтнераў ільнотрасты 3 нумарам. Упэўнены, што вашаму прыкладу, пабольшэвіцку выконваць абавязкі перад дзяржавай, паследуюць калгаснікі вашага раёна і выведуць яго з адстаючых па раду работ—у перадавыя раёны рэспублікі“.

Атрыманне прывітальнай тэлеграмы ад таварыша Гікало яшчэ больш узняло ўсіх калгаснікаў калгаса „Прагрэс“ на далейшыя поспехі і перамогі. **Ш. Міхасеў**

лепшых свіней і кароў. І ў ліку іх—рэкардысткі з групы ордэнаноскі Фёклы Шамко: карова „Вішня“, пароды меціс-галандская, з дзённым удоем 24 літра малака і „Пабеда“—чырвона-беларускай пароды, якая пры першым ацёле дае 18—20 літраў у дзень.

Да прадстаячай зімы тав. Шамко рыхтуецца вельмі сур'ёзна. Вельмі цікавіцца яна, як ацяпляюцца кароўнікі, як шыбы ўстаўляюцца. Цёплая і сытная зімоўка будзе каровам!

Добра цяпер жыць і працаваць Фёкле Міхайлаўне. Сям'я яе забяспечана ўсім патрэбным. Да дню прыезда з Масквы соўгас абсталяваў ёй новую кватэру. І нікеляваны ложак са спружынавым матрацам паставілі. Пасля работы можна добра адпачыць.

Вось толькі граматнасці не хапае Фёкле Міхайлаўне. Палітадзел прымацаваў да Фёклы настаўніцу, якая штодзённа прыходзіць да яе на кватэру. Старанна вучыцца Фёкла Міхайлаўна. Хочацца ёй стаць добрапісьменнай, каб лягчэй было працаваць, каб можна было чытаць газеты, зоатэхнічную літаратуру.

А калі прынялі яе ў групу спачуваючых вялікай партыі Леніна—Сталіна, яшчэ старанней пачала яна вучыцца, каб апраўдаць гэтае ганаровае званне і падрыхтавацца да ўступлення ў кандыдаты партыі.

Ёсць яшчэ адно патаемнае жаданне ў тав. Шамко: хочацца ёй яшчэ раз пабываць у Маскве і пабачыць вялікага Сталіна. Хочацца падзякаваць яго за шчаслівае, радаснае жыццё. А гэта можна заслужыць толькі стаханаўскай работай. Таму яшчэ адданей працуе Фёкла Міхайлаўна.

М. В.

Соўгас імя Свердлова Дзержынскі раён

Дзяўчына з возера

Вечарэе.

Роўнядзь вады чырванее ў развітальных бліках заката. Мерна пераліваюцца хвалі вялікага возера. І над хвалямі—перламутравае неба.

Дзесьці ў яшары заблыталася вадзяная курка і скуголіць—аднастайна і прарэзліва. Калі-ні-калі з вазёрных нетраў вырвецца жвавая краснапёрка, блісне срэбнай лускою ў чырвоных праменнях і знікне.

Бязлюдна. І толькі там, на сярэдзіне возера, чутны ўсплёскі вясла.

З-за чарота і хмызняка відаць два чаўны. На адным з іх—рослая дзяўчына. Яна сядзіць ля руля, моцна і ўпэўнена кіруе плынным ходам чаўна.

— Дзяніс Пятровіч! Можна цягнуць. Адплыва-ай!—

разносіцца над Нешчадрай яе сакавіты голас; рэха імчыць яго далёка-далёка, за берагі, што ўжо губляюцца ў ліловым змроку.

Чаўны, ішоўшы па люстранай паверхні амаль побач, разыходзяцца. Дзевяцісажонны абарэц апісвае правільнае паўкружжа. Грузіла цягне сетку на тваністае дно,—і толькі драўляныя паплаўкі адзначаюць месца закіду.

Поўгадзіны—і чаўны зноў разам. Чатыры пары рук, хутка перабіраючы петлі, цягнуць сетку з вады.

У чаўнах трапыхаюцца буйныя карпы і шчукі.

— Ну, як, таварыш брыгадзір? Здорава выграблі? А ты-ж казаў: позна, ды што вецер не з таго боку, што не ўловім нічога,—смяецца Валя.

Брыгадзір Емельянаў адчувае сябе ніякавата.

— Ды ўжо-ж... Вядома, рыбачка прыродная! У цябе і бацька нейкім нюхам адчуваў—калі і як закідываць... Мусіць, і твае дзеці рыбакамі будуць, а, Валька?—ужо весялей дадае ён.

— Дзеці—не ведаю, няма ящчэ ніводнага, Дзяніс Пятровіч! А вось сама сапраўды кемлю, калі абарцом, калі мярэжамі, а калі і невадам лавіць трэба! Не падвядзеш! Недарма ўжо сёмы год у арцелі...

Сённешняя ўдача—багаты ўлоў—для Валенціны Бурнасенкі не навіна. Адзіная дзяўчына ў пабярэжнай брыгадзе Нешчадранскай рыбнай арцелі, яна даўно ўжо заваявала сабе пашану сярод старых рыбакоў возера.

Яна не адстае ад лепшых ударнікаў рыбалоўлі—Якуба Малахава, Сяргея Мартынава, Васіля Барысава.

З возера ўзняўся буй-вецер, пачалі цямнець люстраныя хвалі Нешчадры. Валі прыгадаўся выпадак, што здарыўся сёлета, у маі месяцы.

... На навальніцу тады бралася з поўдня. Кучаравіліся белыя пенкі на вадзе, возера злавалася і біла ў берагі каламутаю.

А потым спахмурнела. Забліскалі маланкі і грукатам агалосілася далячынь.

— У такое надвор'е,—ды на ваду?—разважалі старыкі.—Ды ні за што ў свеце!

Нейкае асаблівае пачуццё ахапіла гарэзлівую Валю.

— Ах, так? Баіцёся, рыбакі спрактыкаваныя! А план выконваць трэба? А рыбу на пункт везці трэба? Што-ж, па вашаму, дзяржава ад вас цярпець павінна?

У момант адпіхнула яна ад берага човен, села на вёслы—і ўперад!

А бура разыгралася не на жарты. Два разы віхура ледзь-ледзь зусім не перакуліла лёгкі човен. Вада пляскалася пад нагамі і не было як яе вычарпаць. Але мярэжы Валя закінула!

Яна вылавіла тады чатыры вялікія, паўнюткія кошыкі разнастайнай рыбы, і ў гэты-ж бурны дзень адвезла яе за некалькі кіламетраў, у Гарбачэва, на прыёмачны пункт Полацкага рыбучастка.

— Ну, бачыце, і жыва засталася,—жартавала Валя—і не ўтапілася! Эх вы, мужчыны!

... І яшчэ прыгадала яна, як слязмі і сумам апявалася калісьці на вазёрах і рэках Беларусі горкая рыбацкая доля, і як толькі пры совецкай уладзе праца рыбака, як і ўсякая праца, стала справай гонару і славы, доблесці і геройства.

Шчырая і адданая праца рыбака стала і адной з крыніц калгаснай заможнасці. Эх, каб дажыў бацька да гэтых шчаслівых дзён!..

— Але што-ж гэта я задумалася?—перапыніла сябе Валя,—трэба-ж хутчэй сеці развесіць на прасушку, а дзе-ні-дзе і залатаць іх. Шчука пайшла цяпер злюшчая, петлі ірве! Ой, зусім позна ўжо!..

І калі навокал Нешчадры, па берагах, рассыпаліся ў вокнах рыбацкіх хат залатыя агенчыкі і набракшыя абарцы павіслі на ўзбярэжным паркане,—Валенціна Бурнасенка накіравалася дамоў.

У прасторнай, чыстай хаце, з беласнежнымі фіранкамі, кветкамі і добрай мэбляй, павячэраўшы, Валя падлічыла свой сённешні заробак. Ён склаў звыш 10 рублёў.

— Нішто сабе, жыць можна—і не абы як! Вось так крыху падзаробім за год, а тады і на вучобу—у рыбалавецкі тэхнікум. Абавязкова трэба падвучыцца! А пакуль—адпачыць! Да заўтрага...

На заўтра, на зары, над возерам калыхаліся лёгкія туманы, сонца ўставала, выпіваючы іх да дна, і ружавелі берагі.

Возера дыхала спакоем і ўрачыстасцю.

З-за чарота і хмызняка на сярэдзіну Нешчадры выплылі два рыбацкія чаўны брыгады Дзяніса Пятровіча Емельянава. На адным з іх, ля руля, сядзела дзяўчына з шырокім, светлым тварам, радасная і дужая, як сонечны ранак.

Юрка Лявонны

НАМ ПІШУЦЬ

СТАХАНАЎКА ПТУШКАГАДОЎЛІ

Чатыры гады таму назад у калгасе „Чырвоны партызан" арганізавалася птушкагадоўчая ферма. Тады ў ёй налічвалася ўсяго 150 птушак. Памяшканне было дрэннае, неўтульнае, не было брудара.

Зусім іншае становішча зараз. Пабудавана новае прасторнае памяшканне. У ім чыстата, парадак і набыт брудар. На ферме ўжо налічваецца 300 дарослых курэй і 500 цыплят. Усе яны знаходзяцца ў добрым становішчы.

Вялікая ў гэтым заслуга належыць Маланні Паўлаўне Анока, якая працуе на ферме з дня яе арганізацыі. У мінулым годзе Малання Паўлаўна выпрацавала 500 працадзён. За ўзорную работу яе неаднаразова прэміравалі. Была яна і на Усебеларускай нарадзе стаханаўцаў жывёлагадоўлі. Работа т. Анока з'яўляецца бліскучым узорам для ўсіх калгаснікаў.

Рабочы дзень яе праходзіць арганізавана, без мітусні і бегатні. На ферму яна прыходзіць у 5 гадзін раніцы, а то і раней. Перш усяго ўважліва аглядае гаспадарку, а потым прыступае да ўборкі памяшкання: мые падлогу, вымывае пасуду, з якой харчуюцца куры і цыпляты. Пасля гэтага дае курам ежу.

Маланья Паўлаўна ўмела спалучае сваю работу з грамадскай нагрузкаю. Яна з 1930 года член Баршчоўскага сельсовета, член РВК і член праўлення калгаса. У вольныя мінуты яна чытае газеты, журналы і мастацкую літаратуру.

Увечары заўсёды можна ўбачыць Маланью Паўлаўну за падручнікам па вырашчванню цыплят. Гэтым самым яна ўсё больш і больш авалодвае тэхнікай сваёй справы.

В. Ганін

Церахоўскі раён

ПАЧЫН ПАДХОПЛЕН

Вялікі рух жонак стаханаўцаў і ІТР захапіў увесь Совецкі Саюз. Жонкі-актывісткі ўключыліся ў грамадскую работу, каб дапамагчы сваім мужам у іх творчай рабоце.

Рух жонак стаханаўцаў і ІТР шырока разгарнуўся і на нашай фабрыцы. Вынікі работы ўжо даюць сябе адчуваць. Наведзён узорны парадак у сталоўцы, яе зараз нельга пазнаць. Раней там быў бруд і антысанітарыя, а зараз — чыста, утульна. На століках белыя скацеркі, перад абедам рабочыя мыюць рукі і здымаюць спецвопратку. Значна палепшылася якасць харчавання.

Актыўны ўдзел ва ўсёй гэтай рабоце прынялі жонка дырэктара т. Рубенчык, жонка сакратара парткома т. Васерман і жонка загадчыка гаспадаркі т. Ваймовіч. Велізарную работу правялі гэтыя таварышы ў новым фабрычным доме. Па іх ініцыятыве арганізавана дзіцячая пляцоўка для дзяцей рабочых, пражываючых у новым доме. Тут таксама абсталёван чырвоны куток для правядзення культмасавай работы сярод рабочых і жонак рабочых.

Жонкі рабочых і ІТР прымаюць актыўны ўдзел ва ўсёй грамадскай рабоце на прадпрыемстве. Яны заслужылі павагу ўсяго рабочага калектыва. Пачын іх трэба замацаваць і ўцягнуць усіх актывістак у гэтую справу.

Шэхтман

Гомель, фабрыка „Праца"

ТРАКТАРЫСТКА НАСЦЯ

Моцна зайздросціла Насця трактарыстам, якія так упэўнена і бадзёра кіруюць сваёй складанай машынай. У Насці з'явілася вялікае жаданне стаць самой трактарысткай. Хутка яе мары ажыццявіліся. Быў абвешчан набор на курсы трактарыстаў. Лепшую стаханаўку Насцю Капусціну паслалі на гэтыя курсы.

Насця — здольная дзяўчына. Яна з вялікім захапленнем узялася за вучобу — вывучала трактар і прыцэпныя машыны, павышала свае агульнаадукацыйныя веды і курсы скончыла на „выдатна".

— З вялікай нецярплівасцю і радасцю я чакала таго дня, — расказвае Насця, — калі ўпяршыню выехала з трактарыстамі на вытворчы ўчастак. Усё думала пра тое, як пойдзе работа, як-бы не папсаваўся трактар, не здарылася-б аварыя.

Але нічога не здарылася. Насця працавала добра і хутка стала першай трактарысткай у сваім атрадзе. Яна на многа перавыконвала нормы і давала высокаякасную выпрацоўку.

Хутка споўніцца два гады, як Насця працуе на трактары. Увесь час яна дае самую высокую выпрацоўку ў сваім атрадзе. Яшчэ лепш пайшла праца ў Насці ў часе стаханаўскага дэкадніка.

Роўна, без рыўкоў і прастояў, працуе Насцін трактар „ХТЗ—27". Кожную змену стаханаўка-трактарыстка Насця Капусціна ўзорвае па 6—6,5 гектара і з кожным днём павышае выпрацоўку.

Яша Янкаў

Цялушская МТС
Бабруйскага раёна

АД ВІЦЕБСКІХ

БАРАЦЬБА ЗА ЯКАСЦЬ

Стаханаўкай я стала з самага пачатку разгортвання стаханаўскага руху. Раней я працавала на чатырох машынах у трыкатажным цэху, а зараз—на васьмі.

Як я дабілася гэтага? Галоўнае—гэта тое, што я скараціла да мінімума ўсе працэсы сваёй работы. Напрыклад: на адзяванне цыліндра даецца 4 секунды, а я раблю за 2, замену шпулек замест 0,12 секунды я раблю за 0,06—0,05. І так усе працэсы.

З таго часу, як я стала стаханаўкай, заробак мой павялічыўся на 200 проц. Зарабляю я цяпер 400—450 рублёў. Жыву ў светлым і чыстым пакоі, які мне прадаставіла фабрыка. Часта наведваю тэатр, не прапускаю ніводнага новага кінофільма. Чытаю многа мастацкай літаратуры—гэта мой самы любімы занятак.

Зараз усе прадпрыемствы лёгкай прамысловасці рыхтуюцца да стаханаўскага двухдэкадніка. Я таксама рыхтуюся, і ўпаўне гатова да яго. У дні двухдэкадніка яшчэ больш павышу прадукцыйнасць працы і асваенне тэхнічных норм з тым, каб дабіцца яшчэ лепшых паказальнікаў у рабоце.

Але разам з павышэннем прадукцыйнасці працы я стаўлю перад сабой задачу барацьбы за якасць. Мне сорамна за тых трыкатажнікаў, якія праяўлялі зусім недапушчальныя адносіны да совецкага спажыўца. Я прыкладу ўсе свае сілы, каб поўнасцю ліквідаваць брак не толькі ў нашай брыгадзе, але і ва ўсім трыкатажным цэху.

Віцебск, фабрыка імя Клары Цэткін — **Ірына Попель**

ПРА БРАКАРОБАЎ

Барацьба за якасць прадукцыі—гэта адна з важнейшых задач нашай прамысловасці. На працягу апошніх двух тыдняў на старонках „Правды" былі выкрыты нягодныя, небольшэвіцкія метады работы на трыкатажных фабрыках.

Але тое, што выкрыта ў трыкатажнікаў, адносіцца не толькі да іх. Гэта ў аднолькавай ступені датычыцца і нашай ільнопрадзільнай фабрыкі імя Кагановіча. Па паасобных цэхах фабрыкі брак не зніжаецца, а павялічваецца (матальны цэх). Тут некаторыя работніцы абразаюць замест 12 пасм—11. Бывае недамот, або перамот на 200—300 нітак.

Горш за ўсё—гэта тое, што цэхавая адміністрацыя не прымае ніякіх захадаў да бракаробаў, калі не лічыць, што з іх утрымліваюць па 30 кап. за бракаваны з'ём. Але ўтрымка праводзіцца за тыя з'ёмы, якія правяраюцца, а колькі іх праходзіць неправераных!

Аднойчы мы заўважылі, што табельшчыца Зінько захоўвае бракаробаў, і заявілі аб гэтым адміністрацыі. Адміністратары Новікаў і Гурская, замест прыцягнення да адказнасці вінаватых, адказалі, што гэта нас не датычыцца.

У нас маюцца ўсе магчымасці, каб на фабрыцы браку не было. Трэба рашуча знішчыць брак. Ніякай літасці бракаробам, якія псуюць каштоўную прадукцыю!

Віцебск. — **Максімава**

ЗАБЫЛІ ПРА ЎДАРНІКАЎ

Газета „Правда" многа пісала аб тым, што неабходна дапамагчы ўдарнікам падняцца да ўзроўня работы стаханаўцаў, дапамагчы ім стаць стаханаўцамі.

У нас-жа на фабрыцы ўдарнікамі зусім не цікавяцца і нават многія забылі слова „ўдарнік". У выніку стаханаўскі рух на фабрыцы не пашыраецца, а наадварот, зніжаецца: у ліпені было 260 стаханаўцаў, у жніўні—250, а ў верасні нават і таго менш, а рабочых у нас 3500 чалавек.

Нашы фабрычныя арганізацыі ўпусцілі, што ўдарнікі—гэта тыя кадры, якія папаўняюць рады стаханаўцаў. З ударнікамі не займаюцца, не павышаюць іх тэхнічны і агульна-культурны ўзровень.

Забыць аб ударніках—гэта значыць паслабіць тыл стаханаўцаў, звузіць фронт стаханаўскага наступлення.

З недаацэнкай ударніцтва нельга мірыцца. Неабходна нашаму фабкому зрабіць пералом у рабоце з ударнікамі, неабходна аказаць ударнікам практычную і маральную падтрымку, каб яны не адчувалі сябе забытымі. Неабходна стварыць такія ўмовы, каб званне ўдарніка, пасля звання стаханаўца, было самым высокім і пачэсным для кожнага рабочага.

Матрона

Віцебск, ф-ка імя Кагановіча

60 ГОД—НЕ ПЕРАШКОДА!

Далёка за межамі калгаса „Другая пяцігодка" ведаюць знатную цялятніцу Зосю Чарняўскую. Ёй 60 год, але яна заўжды кажа сама пра сябе:

— Мяне і гады не бяруць! Яшчэ буду працаваць ды працаваць на ферме.

Пасада цялятніцы стала для тав. Чарняўскай ганаровай і радаснай. На МТФ яна працуе ўжо больш трох год. Пры ёй стада кароў выросла з 3 да 60 галоў. За тры гады цётка Зося выгадавала 90 цялят без ніякага адыходу. І зараз пад яе наглядам 33 цялёнкі, усе вышэй сярэдняй упітанасці.

Поіць яна іх тры разы на дзень. Праз 12 дзён пасля нараджэння цяляці да 24 дзён дае яму 4 літры малака, потым паступова змяншае норму і дае прымесі.

— Я сваю справу люблю і паважаю,—гаворыць цётка Зося,—у мінулым годзе, дзякуючы гэтаму, я, хаця і старая, зарабіла 450 працадзён. Толькі вось хлявок у нас цесны, трэба каб праўленне калгаса паклапацілася, новы пабудавала!

Віцебскі раён — **С. Шаірка**

РАБКОРАК

ВОПЫТ ПЕРАДАЮ ДРУГІМ

Прачытаўшы ў газеце пра рэкорды тт. Стаханава, Бусыгіна, сясцёр Вінаградавых і другіх стаханаўцаў, я цвёрда рашыла стаць стаханаўкай. Я пачала думаць, як мне даць лепшыя паказальнікі работы. Прадумвала я кожны свой вытворчы крок і прышла да выніку, што магу ўзяць дадатковую аперацыю. Так я і зрабіла: узяла прышыўку кішэняў.

Год прайшоў хутка. За гэты стаханаўскі год я навучылася многаму і ўпэўнілася, што нормы можна выконваць і перавыконваць. Для гэтага патрэбна эканоміць кожную вытворчую секунду, кожны свой крок.

Зараз я выконваю дзве аперацыі: сшываю спінкі ў пальто і прышываю кішэню. З гэтымі двумя аперацыямі я добра спраўляюся. Новыя нормы выконваю на 160—165 проц. Вопыт работы я перадала сваёй зменшчыцы. Яна—лепшая стаханаўка. Мы з ёю кожны дзень спаборнічаем на перавыкананне плана і на лепшую якасць прадукцыі. Браку ў нас няма.

У другім стаханаўскім годзе я буду працаваць яшчэ лепш. Стаханаўцы паказалі, што заўсёды патрэбна крытычна адносіцца да сваёй работы, толькі тады можна даваць усё новыя і новыя ўзоры работы.

Бяру на сябе абавязацельства ў другім стаханаўскім годзе стаць двухсотніцай, выконваць план больш чым на 200 проц. і вопыт сваёй работы перадаць усім рабочым нашага ўчастка.

Паша Абельская

Віцебск, фабрыка
„Сцяг Індустрыялізацыі"

Збор ахвотак на карысць жонам і дзецям байцоў за вызваленне Іспаніі на чырвонасцяжнай ф-цы „Кастрычнік". (Белсаюзфото)

Лёс Кацькай фокінай

Па вечарох, калі цямнела, яна выходзіла на вуліцу. Яна стаяла на рагу, або павольна прахаджвалася, з апаскай аглядаючыся па баках. Іншы раз кідала заклікаючыя погляды на праходжых.

Звонку ёй можна было даць год 35—37, але яна была значна маладзей. Вышэй броваў леглі глыбокія складкі. Ад пастаяннай афарбоўкі бровы сцерліся, і ад гэтага чорная палоска, абыяк праведзеная паўдугой, бывала асабліва прыкметна.

Вусны былі густа нафарбаваны, а густыя, каротка падстрыжаныя валасы апалены шчыпцамі.

Яе звалі Кацькай. Кацька! Гэта зняважлівае імя для жанчыны сярэдніх год гучэла асаблівым здзекам.

Але апроч імя нічога не ведалі пра яе.

Удзень яна ніколі не паказвалася на вуліцы, а вечарамі заўсёды хадзіла адна. У мінуты кароткіх знаёмстваў, якія ў яе ўзнікалі, яна часцей за ўсё маўчала, або абмяжоўвалася кароткімі, лаканічнымі адказамі.

Усмешкі ніколі не было на яе твары, ніхто не чуў смеху з яе вуснаў. А калі шчодрыя „госці“ частавалі яе, яна напівалася дап'яна і рабілася яшчэ больш спахмурнелай. Раз'юшаныя „госці“ нярэдка білі яе за гэту „дурасць“.

Здаралася, што які-небудзь „сердабольны“ прабаваў выклікаць яе на шчырасць:

— Кацінька! Чаму ты сумуеш?

Але яна адварачвала галаву, маўчала, або каротка адказвала:

— Не я сумую, сэрца сумуе...

І ўсё.

Так да яе імя дадалося яшчэ адно слова, Хмара. Кацька Хмара!

Але тыя, хто прыдумаў гэтае слова памыліліся. Не „Хмарай“, а „горам“ трэба было-б назваць гэту жанчыну, таму што гора яна перанесла не мала.

І ад таго яшчэ глыбей рабіліся складкі вышэй броваў, і ад таго яшчэ больш пахмурай і маўклівай рабілася жанчына.

Дзяцінства яе прайшло ў Сабачым гарадку Горлаўкі.

Маці памерла пры нараджэнні Каці. У сям'і было яшчэ трое дзяцей, мізэрнага заработку бацькі, вядома, не хапала, і старэйшая сястра рана пайшла на вуліцу. Бацька—суровы і змрочлівы шахцёр—ведаў гэта, але віду не паказваў і кожны раз, калі дачка позна вярталася дамоў, з болем запытваўся:

— Што, Дуняша, у падружкі была?

Дванаццацігадовы Іван працаваў ужо канагонам і жыў у шахцёрскім інтэрнаце. Дамоў ён прыходзіў толькі па выхадных днях. Змучаны, знясілены, паваліўшыся на атрэп'е, ён спаў да наступнай раніцы. Калі-ж надыходзіў час ісці на работу, яго будзілі і, праціраючы вочы і разгублена аглядаючыся па баках, ён панура ішоў у шахту, пад зямлю, да сваёй сляпой клячы „Джонкі“.

Аднойчы, калі Каці было дзевяць год, у вакно іх цёмнай каморкі злякана пастукалі:

— Каця! Бягі да шахты, бацьку задавіла!

Так яна страціла бацьку. Пасля таго сям'я развалілася. Дуняша аддала сястронку ў людзі, а сама паехала невядома куды. Спачатку Каця бадзялася па вёсках, потым—ёй не было тады і трынаццаці год—нанялася пасвіць кароў у аднаго дробнага памешчыка.

Аднойчы, калі дзяўчынка ўжо зганяла жывёлу на выган, прышоў сам гаспадар. З'яўленне гэтага пажылога, але яшчэ моцнага мужчыны, з даўгімі пасівеўшымі вусамі, напужала Кацю, і таму яна пачала яшчэ больш энергічна зганяць у адно месца статак паслухмяных кароў.

Гаспадар падышоў бліжэй.

— Чаго ты ў такіх лахманах ходзіш? Сукенкі няма? Апрануцца трэба! Загадаю табе сукенку потым купіць. Ну, падыйдзі-ка бліжэй. Хадзі, не бойся.

А потым адбылося страшэннае, звярынае. Яна апомнілася, калі ён ужо адыходзіў і, павярнуўшыся з дарогі, кінуў:

— Глядзі-ж, маўчы! Адзенне куплю. Апрану.

Досвіткам дзяўчынку паўжывую знялі з пятлі, якую яна накінула на іржавы блок.

Пяць дзён ляжала яна ў свірне, уткнуўшыся галавою ў колкі пук саломы... Ссохла ад слёз, а потым неяк ноччу сабрала вузялок і пайшла з вёскі.

Шырокі шлях, якім пайшла пакалечаная дзяўчынка, вёў у вялікі прыдняпроўскі горад. У яе дзіцячай памяці затрымаўся расказ бацькі аб тым, што ў гэтым горадзе жыве сястра нябожчыцы мацеры.

Сем дзён, як зацкаваны звярок, пералякана блукала дзяўчынка па заблытаных артэрыях велізарнага горада. Стукалася ў дзверы чужых кватэр, нясмела спыняла праходжых:

— Скажыце, калі ласка, вы не ведаеце, дзе жыве Марыя Іванаўна Пастухова?

Цёткі яна так і не знайшла.

Аднаго разу ў часе пошукаў дзесьці на краі горада ёй удалося атрымаць месца ў капялюшнай майстэрні мадам Софі.

Мадам, якая ледзь перасоўвала ногі ад паўнаты, уважліва разгледзіла яе праз ларнетку, загадала некалькі разоў павярнуцца на месцы, рукою падняла падбародак, як гэта робяць з канём, і, нарэшце, вынесла спрыяльнае рашэнне:

— Ну, заставайся, дзяўчынка, але толькі памятай, грошай я табе плаціць пакуль не буду. Потым, пазней... Ну, вядома, маё харчаванне. Я цябе апрану, няёмка так хадзіць—да нас прыходзяць госці, гэта значыць заказчыкі,—паправілася слова-ахотлівая мадам.

Ужо цераз дзень Кацю здзівіла, што з пяці масцярыц, што пастаянна пражывалі ў мадам, толькі дзве займаюцца шыццём капелюшоў, астатнія-ж звычайна вельмі позна спяць. Потым, прасынаючыся, лаюцца паміж сабой ці з гаспадыняй, пасылаюць Кацю за гарэлкаю, падоўгу круцяцца вакол люстэрка і толькі пачынае шарэць, ліхаманкава прыступаюць да доўгага працэса апранання.

А ласкавая мадам аказалася лютай ведзьмай. Сама абжора і лакамка, яна дзяўчат ніколі не карміла дасыта.

Каці адвялі для начлега пакой у невялікім флігелі, стаяўшым у канцы двара. Толькі наступаў вечар, як гаспадыня адпраўляла яе:

— Ідзі, папрацуй, зрабі выкрайку новага парыжскага фасона, але не сшывай, пакуль я не праверу.

Кацю ўзялі прыбіральшчыцай, але гаспадыня заўважыла яе майстэрскае ўменне шыць і стала адначасова прывучаць да капялюшнай справы. Каці купілі новую сукенку, адна з масцярыц, палюбіўшая дзяўчынку за мяккасць характару, пашыла ёй капялюшык.

Мадам Софі, заўважыўшы яе новае адзенне, загадкава ўсміхнулася і ўхваляюча кіўнула галавой.

Прайшло 6 месяцаў. Каця ўжо прызвычаілася да новай абстаноўкі, пасябравала з масцярыцамі і стала забывацца аб перажытым. Але ў гэты час гаспадыня здзівіла яе навіною:

— Ты ўжо вялікая і з сёнешняга вечара будзеш дапамагаць нам прымаць гасцей. Што ты так пералякалася? Не падабаецца,—можаш зараз-жа ўбірацца. Пакінь сукенку, капялюшык і ідзі.

Каця прыткнулася да сцяны і заплакала.

Прышлося застацца, іншага выхада не было...

Пацягнуліся страшэнныя ночы і дні. Беспрабуднае п'янства, нечаканыя з'яўленні паліцэйскіх і, нарэшце, высылка ў другі горад.

Вуліца. У дваццаць год яна ўжо выглядала як трыццацігадовая, а ў дваццаць пяць ёй давалі і таго больш.

Неяк на вакзале аднаго горада, куды яна прыехала пасля чарговай высылкі, у акне поезда, які адпраўляўся далей, яна ўбачыла прыгожа апранутую жанчыну. Твар яе здаўся блізкім і родным.

— Дуня!..—ускрыкнула Каця і пабегла да поезда, але калёсы паскорылі ход і ўнеслі сястру.

Падаўленая і расстроеная пайшла Каця ў горад.

* * *

Асенні вечар. Касы дождж аднатонна біў па шыбінах. На рагу дрэнна асветленага скрыжавання вуліц стаяла ўсё тая-ж жанчына. Шмат што змянілася за апошні час. Трэці год ужо не было паліцэйскіх. У горадзе два разы былі чырвоныя войскі. Яны на час пакінулі горад, каб хутка вярнуцца зноў і ўжо назаўсёды. А покуль наўкол горада арудвалі бандыцкія зграі.

Жанчына не разумела таго, што адбывалася, але ёй стала яшчэ цяжэй жыць. Госці рэдкія. Хлеба мала. Голад гнаў яе ў людныя месцы.

Пасля бою, які данёсся да горада толькі далёкім водгуллем гармат, у трэці раз і цяпер ужо назаўсёды ўвайшлі конныя чырвоныя часці.

Жанчына хадзіла па вуліцах, у вачох яе быў адчай. Яна была галодная.

Між тым байцы спешыліся і страхвалі пыл з адзення. Жанчына хадзіла паўз іх рады, але яе ніхто не заўважаў. Вось адзін маладзенькі з чырвонай стужкаю цераз фуражку спыніў яе:

— Грамадзяначка, чаго вам тут трэба?

У адказ яна зрабіла намаганні і ўсміхнулася:

— Маладзенькі, пойдзем са мною!

Баец пакінуў каня і падышоў да яе бліжэй.

— Ты чаго задумала? А ну-ка давай у штаб!..

Яна ішла наперадзе яго, схіліўшы галаву:

— Я галодная...

У штабе іх сустрэў палітрук—літовец Эліас.

Ломанай рускай моваю ён запытаўся байца.

— Нікіфараў, каго вы прывёў?

— Ды вось тут, таварыш палітрук, адна грамадзянка блукае, гаворыць—галодная.

Палітрук уважліва паглядзеў на знясілены твар жанчыны.

— Нікіфараў, прынясі паесці.

Жанчына з прагнасцю накінулася на ежу.

Палітрук кідаў на яе іспытальныя погляды...

— Хто вы? Дзе ваш дом? Што ваша работа?

Жанчына спачатку ўсхліпнула, а потым не вытрымала, разразілася ўзрыдамі.

Палітрук і баец абступілі яе з двух бакоў пачалі заспакойваць цёплымі словамі.

Але яна яшчэ ніколі не чула такіх слоў, і таму ўзрыды яе сталі яшчэ больш пякучымі.

— Пачакайце, я дамоўлюся з камандзірам, магчыма мы вас прыстроім на кухні,—сказаў палітрук і пайшоў кудысьці.

Жанчына патроху сціхла, узняла галаву, спыніла слёзы і хуткім рашучым гэстам сцерла фарбу з вуснаў.

* * *

У аднэй з ваенных часцей ішла гутарка—абмеркаванне праекта новай Сталінскай Канстытуцыі. Людзі славілі надзвычайнае сёння і са смуткам прыгадвалі мінулае.

У канцы гутаркі слова папрасіла старая жанчына—загадчыца сталовай начскладу, якая нязменна працуе пятнаццаць год ужо на гэтым участку. Яна пачала...

Апавяданне Кацярыны Пятроўны Фокінай, а гэта была яна—пакінула ва ўсіх прысутных глыбачэйшае ўражанне. Слаўныя людзі—байцы вялікай Чырвонай арміі—апускалі долу вочы, затуманеныя горкай слязінай.

Паціху выцірала слёзы і сама Кацярына Пятроўна, якая толькі на 35—36 годзе свайго жыцця стала чалавекам.

Еф. Садоўскі

Цана 20 кап.

У гэтым нумары бясплатна дасылаецца ўкладка-выкрайка.



(Белсаюзфота).

У дзіцячым садзе.

Адказны рэдактар М. І. ВОЛГІНА.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом друку, 3-ці паверх, пакой 60. Тэл. 24-118.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 1050. Тыраж 8.730. Уп. Галоўліта № 581.
Здана ў набор 1-X—36 г. Падпісана да друку 17-X—36 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.